Hety Nr. „Bieł. Krynicy“ z dadatkam „Praleski“

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 45 (638). Wilnia, Niadziela 1 Śniežnia 1935 h. Hod XI (XIX)

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

ŠKOLNY KURATAR AB ŠKOŁACH I AB BIEŁARUSACH

„Kur. Wil.“ z dn. 26.XI siol. pad zahałoŭkam „Szkoła, jej braki i potrzeby“ pamiaściŭ referat Kuratara Wilenskaha Skolnaha Wokruhu na sabrańni pasłoŭ i senataraŭ, jakija majuć być pradstaŭnikami biełaruska-litoŭskich ziamiel pad Polščaj. Z referatu dawiedwajemsia nastupnaje

— U biahučym školnym hodzie ŭsich dziaciej u školnych hadoch u wilenskim školnym wokruzie (wajawodztwy: Wilenskaje, Nawahradzkaje i ŭschodniaja čaść Biełastockaha) naličajecca 483,049; z ich wučycca 416,876 (86,1 prac.), nia wučycca 66,993 (13,9 prac.). Dzieci, što chodziać u školu ŭ miestach i miastečkach, majuć dapamohu ježaj, adzietkam i inš., dzieci-ž wiaskowyja padobnaj apieki nia majuć badaj zusim.

U škołach siarednich wučacca pierawažna dzieci baćkoŭ z miesta, dziaciej sialanskich duža mała i tych lik uściaž źmianšajecca.

Zaznačajecca ŭpłyŭ nia tolki kultury polskaj na biełarusaŭ i litoŭcaŭ, ale tak-ža naadwarot: i palaki pryniali niekatoryja wartaści miascowaj kultury, dziakujučy čamu stwaryŭsia tut asobny typ palaka.

Na 390.000 dziaciej u publičnych škołach jość 128,740 dziaciej, katorych rodnaj mowaj jość mowa biełaruskaja i 10.234, katorych rodnaj mowaj jość mowa litoŭskaja. Litoŭcy nacyjanalna świedamyja i damahajucca swajej škoły. Jość nadzieja, što sprawy litoŭskaj škoły i ahułam litoŭskaj aświety ŭłožacca zhodna z pačućciom polskaj dziaržaŭnaści.

Biełarusam nie chapaje świedamaści, a zhetul wynikaje i toje, što jany nie damahajucca škoły ŭ rodnaj mowie. Ciapier jość 69 škoł, u jakich uziata pad uwahu biełaruskaja mowa, a tak-ža jość biełaruskaja dziaržaŭnaja himnazija ŭ Wilni. U škołach užywajucca biełaruskija čytanki, drukujecca biełaruski śpieŭnik. —

Woś hałoŭnyja punkty referatu Školnaha Kuratara ab škole ŭ jaho wokruzie. Pradusim treba ściwierdzić, što infarmacyi jaho ab biełarusach duža niatočnyja i staronnyja. Na 390,000 dziaciej u publičnych škołach tolki 128,740 dziaciej, heta zn. tolki, kala jakoj treciaj častki, rodnaja mowa biełaruskaja. Dyk jak heta mahło stacca, što na terytoryi, na jakoj žywuć biełarusy ŭ bolšaści, mienšaść dziaciej maje rodnuju mowu biełaruskuju? Jasna, što dziaciej biełarusaŭ katalikoŭ mowaj rodnaj uważajecca mowa polskaja; škada, što Kuratar nie padaŭ statystyki henych dziaciej pawodle relihii, z hetaha šmat čaho možna było-b dawiedacca cikawaha. Mnohich peŭnież dziaciej i biełarusaŭ prawasłaŭnych mowaj rodnaj zapisana mowa polskaja, bo-ž wučyciali zapiswajuć zwyčajna tak, jak chočuć, a jak jany chočuć, my dobra wiedajem.

Dziŭna mała, bo tolki 10.234 naličyli školnyja ŭłady ŭ publičnych škołach dziaciej litoŭskich (u litoŭskich škołach prywatnych dziaciej tolki 1.047). Jasna, što i litoŭskim koštam pawialičany lik dziaciej polskich.

Najbolš urešcie pikantna razważaje Kuratar ab biełaruskaj świedamaści i ab tym, što biełarusy byccam nie žadajuć swajej škoły. Hetkaje ćwierdžańnie pradusim supiarečnaje z tym, što 128.740 dziaciej u publičnych škołach uwažajuć swajej matčynaj mowaj mowu biełaruskuju, bo kali až hetaki lik dziaciej trymajucca swajej mowy i nacyjanalnaści, dyk chiba-ž jany tymbolš žadajuć mieć swaju rodnuju škołu. I hetak jość sapraŭdy.

A kali jdzieć ab toje, što byccam biełarusy nie damahajucca swajej škoły, dyk treba skazać, što jany damahajucca, ale ich damahańniaŭ nia słuchajuć i, treba skazać, što pry panujučych palityčnych warunkach, nia tak lohka swaje damahańni wyjawić.

Praŭda, adnosiny polskich školnych uładaŭ da školnych patrebaŭ biełarusaŭ biełaruskija sialanskija masy źnieachwocili, i jany, nia wieračy ŭ toje, što hetyja ŭłady spoŭniać ich kulturnyja žadańni i patreby, masawa pierachodziać na aświetu pazaškolnuju, časta ŭważajučy jaje, jak swajho rodu konspiracyju.

Praŭda, dobra j heta. Ale susim niadobra, što biełaruskija masy, nia wieračy ŭ pažadany wynik, bolš pačynajuć canić aświetu pazaškolnuju, jak školnuju. Woś-ža abawiazkam źjaŭlajecca biełaruskaha hramadzianstwa źwiarnuć na hetu sprawu asabliwuju ŭwahu, kab parušyć biełaruskija narodnyja masy ŭ kirunku składańnia deklaracyjaŭ na biełaruskija dziaržaŭnyja škoły. Heta budzie najlepšy adkaz Kurataru na jaho infarmacyi ab biełaruskaj školnaj sprawie.

Gaudeamus igitur...

Пятнаццаць гадоў таму назад сьведамыя беларускія студэнты Віленскага Унівэрсытэту заснавалі БЕЛАРУСКІ СТУДЭНЦКІ САЮЗ.

Сёлета ўрачыста сьвяткуюць гэты мамэнт беларускія студэнты. Да гэтага сьвяткаваньня аднак мае права і старэйшае грамадзянства, раз дзеля таго, што шмат хто выйшаў з радоў гэтага Саюзу ды што кожны сьведамы беларус супольна перажывае ўсе радасьці і турботы свайго роднага студэнцтва.

Сьвяткуем гэтыя ўгодкі БССаюзу і мы, што няўтомна сочым за ўсякімі праявамі беларускага жыцьця ды адбіваем яго на бачынах „Беларускай Крыніцы“. Ня раз і неаднальковыя траплялiся ў нас абразы з жыцьця БССаюзу. Заўсёды аднак аднолькавым ёсьць наша становішча, — каб беларускі студэнт быў прыкладным студэнтам і такім-жа грамадзянінам. Вітаем працу беларускага студэнцтва ўсюды, але прад усім хочам яго бачыць пры працы над самым сабою і над сваімі равесьнікамі. Гэта-ж жаданьне складаем і Беларускаму Студэнцкаму Саюзу з нагоды ягоных угодкаў.

Рэдакцыя „БЕЛ. КРЫНІЦЫ“.

У справе абнаўленьня Б. Х. Д.

Справа абнаўленьня Б.Х.Д. бязумоўна зьяўляецца сёньня аднэй з найважнейшых праблемаў у жыцьці Заходняй Беларусі.

Бо як гэта ні сумна, але БХД. ёсьць сёньня адзінай легальнай арганізацыяй, якая рэпрэзэнтуе пагляды і імкненьні калі ня большасьці, то прынамсі значнае часьці беларускага грамадзянства. І абнаўленьне гэтай арганізацыі мусіць быць даканана хоцьбы дзеля таго, каб даць магчымасьць аб'ядначца ўсяму беларускаму народу. Гэта ня толькі яе маральнае права, але і абавязак, за выпаўненьне якога перад народам і гісторыяй дасьць адказ!

Абнаўленьне БХД. абыймае 1) зьмену назову і 2) зьмену праграмы.

Да 1). Справа назову мне выдаецца найменш важнай справай. Не ў назове, а ў чыне месьціцца сіла арганізацыі. „Грамада“ не называлася: „радыкальнай,“ ані „хрысьціянскай,“ — а вунь які ўплыў мела! Чым назоў карацейшы і прасьцейшы, тым лепш. Асабіста нічога ня маю супроць назову: „Белар. Народн. Аб'едн.“

Да 2) Без параўнаньня важнейшай ёсьць справа зьместу праграмы арганізацыі.

Хіба ніхто не запярэчыць, што побач глыбока рэлігійных,— ёсьць нямала чэсных і энэргічных беларусаў вольнадумцаў, якія ніколі ня ўпішуцца ў арганізацыю з рэлігійнай афарбоўкай.

Таксама нямала беларускіх радыкалаў устрымлівалася ад супрацоўніцтва з БХД з увагі на яе асьцярожнасьць у галіне сацыяльных перамен.

Можа ня зусім пажаданай была і лішняя каталіцкасьць БХД., якая ня зусім магла падабацца праваслаўным беларусам.

Арганізацыя, прэтэндуючая да рэпрэзэнтаваньня інтарэсаў усяго беларускага народу, павінна выйсьці за межы рэлігійнасьці і тае ці іншае сацыяльнае праграмы.

Сьцяг Беларускага Народн. Аб'еднаньня павінен абняць усіх дзяцей свае Бацькаўшчыны, так праваслаўных, каталікоў, як і вольнадумцаў! Ня будзе агульнанароднай арганізацыяй тая, якая прыме ў свае рады „верных,“ а адкіне „няверных“ і наадварот. І дзеля гэтага да сёньняшняга дня ня была такой арганізацыяй ані БХД., ані КПЗБ.

Агульнабеларуская арганізацыя павінна прыгарнуць да сябе кожнага Беларуса, маючага сваім ідэалам Незалежнасьць Бацькаўшчыны!

Таксама ня можна зацясьняць сацыяльнай праграмы.

Не дзялем скуры нязлоўленага мядзьведзя!... Ня мы выгадавалі беларускі народ і ня мы будзем накідаць яму тыя ці іншыя сацыяльныя формы! Дайма магчымасьць нашай вёсцы вызваліцца з цемнаты, бяднoцтва, а тады вёска сама сабе дарогу знойдзе!...

Дык падсумоўваючы: агульнабеларуская арганізацыя не павінна быць ані „хрысьціянскай“ ані „бязбожніцкай,“ — ані „капіталістычнай,“ ані «камуністычнай»... Ня можна справы духавенства, — або справы ўласнага загону ці калектыву, — ставіць перад справай незалежнасьці! Не каталік ці праваслаўны, — не капіталіст ці камуніст дабіваецца лепшай долі, але Беларус!!!

Свабода перакананьня і слова, — мэта незалежнасьць, — вось якім павінен быць зьмест агульнанароднай арганізацыі!

Мгр. Аляксей Анішчык.

З паданых у нумары 39 „Бел. Крыніцы“ ў камунікаце Прэзыдыюму Ц. К. БХД тры назовы для абноўленай БХД я прыхіляюся да аднаго — „Беларуская Народная Радыкальная Партыя“.

Я фактычна да арганізацыі БХД не належу, але гэтая абнова яе і мяне, як дзейнага беларуса, ня менш цікавіць, як яе, БХД, сяброў.

На мой пагляд, „Беларуская Народная Радыкальная Партыя“, хоць сваім назовам зможа абняць і меншы лік людзей ад іншых назоваў, але партыйна зарганізаваныя людзі сільнейшыя ідэова і больш дысцыплінаваныя.

Усялякія „Аб'еднаньні“ людзей не арганізуюць і да інтэнсыўнай дзейнасьці яны менш здольныя.

Наваградчына. **Март. Ів.**

24055

Сьв. памяцi **АНТОН БЕЛЕНКО**,

на 22 годзе жыцьця памёр у Наваградзкiм шпiталi 23 лiстапада а 9 гадзiне ўвечары ад прастрэлу а 8 гадзiне ранiцай таго-ж дня камiсарам двара Мiроўшчына, аб чым паведамляюць агорнуты глыбокiм жалем

бацьнi, браты i сёстры

Гiрычы, 25.XI.1935.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

З дзейнасьцi Вiленскага Аддзелу БIГiК. У мiн. нядзелю 24 лiстапада а гадз. 17-тай у залi Iнстытуту пры Завальная вул. 1—1. Др. Малецкi прачытаў I ую часьць свае навукова-папулярнае лекцыi на тэму: *„Мы i наша Бацькаўшчына“*. Была гэта, як нас iнфармуюць, спроба здаволiць жаданьне перад усiм рамесьнiцкай i работнiцкай моладзi, якая апошнiм часам пачала праяўляць сваё зацiкаўленьне беларускiм пытаньнем. З таго, што на лекцыю запраўды зьявiлася многа слухачоў, вiдаць, што ў масах ужо ёсьць голад здаровай духовай стравы. Арганiзатары i лектар выканалi сваё заданьне добра. Другая часьць (заканчэньне) лекцыi адбудзецца ў нядзелю 8 сьнежня, там-жа. Лепш бы было, здаецца, каб рэфэраты былi крыху карацейшыя ды каб перапляталiся дэклямацыямi i песьнямi.

Урачыстае сьвяткаваньне XV угодкаў iснаваньня Беларускага Студэнцкага Саюзу адбудзецца ў нядзелю 1-га сьнежня 1935 году ў гэткiм парадку: А 9-тай гадзiне Урачыстае Набажэнства ў касьцеле сьв. Мiкалая (зав. сьв. Мiкалая). А 12-тай гадзiне Малебен у Пятнiцкай Царкве (вул. Вялiкая). А 16-тай гадзiне Урачыстая Акадэмiя ў залi Сьнядэцкiх (Галоўны будынак УСБ). А 22 тай гадзiне вечарына ў залi Лiт. Студ. Саюзу (Вiленская 28—1).

З выдавецкай нiвы Гэтымi днямi выйшлi з друку кнiжыцы:

„Rady chworym i zdarowym“ др. Станiслава i др. Ядвiгi Грынкевiчаў. Частка I. Аб заразных i iншых хваробах. Вiльня 1935. Выданьне „Беларускай Крынiцы“. Кнiжыца мае 120 бачын разьмеру 8⁰. Цана 50 гр.

„Biełarusy ŭ światle praŭdy“ — кс. праф. др. Я. Тарасэвiча. Выд. „Chryścijanskaj Dumki“. Кнiжыца мае 40 бачын разьмеру 8⁰. Цана 20 гр. Галоўны склад гэтых кнiжыц — кнiгарня „Пагоня“, Вiльня, Завальная 1.

З Беластоку. Надовячы мясцовая адмiнiстрацыя перадала маемасьць Т-ва Беларускае Школы ў „Dom Prawosławnych Polaków“.

Варта, каб гэтай справай зацiкавiлася Галоўная Управа Т. Б. Ш.

Wialiki palityčny praces u sprawie zabojstwa ministra Pierackaha

Praces u sprawie zabojstwa ministra Pierackaha, ab pačatku jakoha my padawali ŭ prošłym numary „Bieł. Krynicy,“ wyklikaŭ wialikaje zacikaŭleńnie wa ŭsiej Polščy i zahranicaj. Z usiej Polščy i šmat z zahranicy prybyło ŭ Waršawu karespandentaŭ roznych hazet, jakija šyroka apiswajuć pačutaje na hetym pracesie. Ważniejšyja mamenty hetaha apisańnia padajom nižej:

Bajawiki ukrainskaha padziamiella O.U.N. na ławie abwinawačanych u Waršaŭskim Akružnym Sudzie.

Pawodle aktu abwinawačańnia ŭsie padsudnyja heta bajawiki ŭkrainskaj tajnaj nacyjanalna-rewalucyjnaj arhanizacyi, jakija chočuć siłaj ustanawić niezaležnuju ukrainskuju dziaržawu.

Padsudnych dapytywali ŭ sudzie pa adnamu, ale nie dapytalisia, bo padsudnyja, adzin za druhim, zajaŭlali, što saznańnie buduć dawać tolki paukrainsku. Sud pryniaŭ hetkuju zajawu, jak admowu padsudnych dawać saznańnie. Waršaŭski praces z usich dasiulešnich pracesaŭ O.U.N. u Polščy maje najsilniej padčyrknuty palityčny charaktar. Słuchajuć hetaha pracesu delehaty ministerstwa ŭnutranych i zahraničnych spraŭ. Hetaje zacikaŭleńnie nie ahraničajecca ŭ mieżach Polščy, ale wybiahaje i zahranicu.

Litwa i Čechasławaččyna prad waršaŭskim trybunałam.

Akt abwinawačańnia, u sprawie zabojstwa min. Pierackaha, paświačaje adzin wialiki raździeł Litwie, dzie haworycca ab finansawańni i padtrymliwańni ukrainskich terorystaŭ. Pry hetym akt abwinawačańnia ćwierdzić byccam što faktyčny zabojca ministra Pierackaha ŭciok u Čechasławaččynu, dzie OUN. mieła swaje tajnyja arhanizacyi i dzie tajna prabywali kiraŭniki ukrainskich terorystaŭ.

Tut treba prypomnić, što niekatoryja polskija hazety, nia raz pišačy ab ukrainskaj sprawie, časta ŭspaminali proźwišča pałk. Kanawalca, nazywajučy jaho hałoŭnym kamandantam špiarša UWQ. (Ukrainskaja Wajskowaja Orhanizacyja), a pośle OUN. (Orhanizacyja Ukrainskich Nacyjanalistaŭ), ćwierdziačy, što pałk. Kanawalec najbolš prabywaje ŭ Berlinie. Adnak u akcie abwinawačańnia, u jakim ad pačatku da kanca haworycca ab tajnych arhanizacyjach UWO. i OUN., — ab dziejnaści hetych arhanizacyjaŭ na terytoryi Niamieččyny i ahułam ab prabywańni tam ukrainskich terorystaŭ ničoha nie haworycca

Ćwierdžańnie aktu abwinawačańnia, što ŭkrainskija terorysty ŭ Litwie mieli padtrymańnie z boku tamašniaha ministra zahraničnych spraŭ, wyklikała šyrokaje hazetnaje zacikaŭleńnie. U adkaz hetamu, litoŭskaje aficyjalnaje ahienstwa „Elta“ wydała zapiarečańnie, što ukrainskich terorystaŭ litoŭski ŭrad ani finansawaŭ ani padtrymliwaŭ jakim inšym sposabam.

Hety wialiki palityčny praces adbywajecca dalej, wiestki ž ab im šyroka i hromka razychodziacca pa ŭsim świecie.

k.

Z wajennaha frontu ŭ Afrycy

Hetymi dniami abisyncy pačali nastupać na italijancaŭ i dawoli ŭdačna — italijancy raźbityja adstupajuć. U bitwie kala Unale abisyncy adabrali ad italijancaŭ 4 tanki i 6 braniawikoŭ-aŭtamabilaŭ. Paŭstała panika ŭ italijanskim wojsku i achapiła ŭsie garnizony ŭ Gorrybei i Gerlogubi. Italijancy ŭciakajuć da Ual-Ual War-Dair.

Na hetym froncie ŭ Ogaden italijancy stracili ŭsiu terytoryju, jakuju byli zdabyŭšy za 55 dzion wajny.

Japonija ŭ paŭnočnym Kitaju

Prawincyi paŭnočnaha Kitaju, u sprawie jakich my pisali ŭ prošłym numary, pačali abwiaščacca aŭtanomnymi. Japonskaje wojska rasparadžajecca ŭ hetaj krainie zusim swabodna, jak choča, i prabirajecca ŭžo da Pekinu.

Rewalucyja ŭ Brazylii

U paŭdzionnaj Amerycy ŭ Brazylii hetymi dniami wybuchnuła kamunistyčnaja rewalucyja. U Rio Grande del Chorte kamunisty ŭtwaryli rewalucyjny ŭrad i pawiali baraćbu za ŭładu wa ŭsim kraju. Nia ŭsio wojska pryłučyłasia da kamunistaŭ; bolšaść jaho wystupiła praciŭ kamunistyčnaha ŭradu. Chto pieramoža — pabačym.

Polski „Sialanska-Rabotnicki Front“

Siarod niekatorych hrupaŭ polskich maładych piśmieńnikaŭ i publicystaŭ, jak my padawali ŭ prošłym numary „Bieł. Krynicy“, utwaryŭsia suproćfašystoŭski supolny front. Ale heta, pakulšto, front małoj hrupy roznamoŭnaj intelihiencyi, jakaja wialikimi ŭpływami na pracoŭnyja masy jašče pachwalicca nia moža. Adnak klič stwareńnia „Sialanska-Rabotnickaha Frontu“ suproć kapitalistyčna-abšarnickaha fašystaŭskaha frontu, u polskaj h. zw. „chłopskaj“ presie prajaŭlajecca štoraz čaściej i macniej.

Polskaje rabotnictwa dasiul znachodzicca ŭ bolšaści pad upływami Polskaj Partyi Socyjalistyčnaj (P.P.S.), jakaja adnosna sučasnaha režymu ŭ Polščy zajmaje stanowišča apazycyjnaje. Majuć na polskaje rabotnictwa ŭpływy i inšyja marksoŭska-socyjalistyčnyja kirunki, a tak-ža i hrupy socyjalna-chryścijanskija. Słowam, polskaje rabotnictwa z hledzišča socyjalna-ideowaha, a tak-ža i farmalna-arhanizacyjnaha dawoli drobna padzielenaje.

Sialanstwa polskaje mała lepš arhanizawanaje, jak sialanstwa našaje, biełaruskaje. Sialanskich partyjaŭ u Polščy wielmi mnoha i ŭsie jany miž saboju swaracca. Na pawadyrstwa polskaha sialanstwa pretendujuć hetkija polskija partyi: „Stronnictwo Chłopskie“, „Stronnictwo Ludowe“, „Wyzwalenie“, „Piast“ i inšyja.

Hetak woś pradstaŭlajecca „arhanizawanaść“ polskich pracoŭnych masaŭ, jakija, pawodle kliču „Sialanska-Rabotnickaha Frontu“, pawinny suproćstanuć abšarnicka-fašystoŭskamu frontu, jaki, kaža toj-ža klič, stanowiać polskija partyi: B.B., „Stronnictwo Narodowe“ (endecyja), „Obóz Narodowo-Radykalny“ i „Chryścijanskaja Demokracyja“.

Pry hetym treba adznačyć, što ŭ Polščy i miž hetymi fašystaŭskimi partyjami niama adnaho wa ŭsim supolnaha frontu — u sprawach nutranych, za ŭładu, jany miž saboju swaracca na „žyćcio i śmierć“. Supolny front miž hetymi partyjami tworyć tolki ichniaja nacyjanalistyčnaja ideolohija ŭ adnosinach da niapolskaha nasielnictwa ŭ dziaržawie i ŭ sprawach pašyreńnia polskaj nacyjanalnaj ekspansii, jak najšyrej i jak najdalej. Treba adznačyć tak-ža i toje, što ŭ sprawie nacyjanalnaj ekspansii z hetym fašystaŭskim frontam dasiul zusim salidaryzawaŭsia i front praciŭfašystaŭski — P.P.S., „Stron. Chłopskie“, „Piast“, „Stron. Ludowe“, „Wyzwalenie“ i inšyja. My nidzie i nikoli jašče nia čuli, kab chtokolečy z hetaha „Sialanska-Rabotnickaha Frontu“ wystupiŭ u abaronie Biełarusaŭ, Ukraincaŭ, Litoŭcaŭ. Jašče nikoli i nichto z hetaha polskaha „Sialanska-Rabotnickaha Frontu“ nia pryznaŭ samastojnaści i niezaležnaści biełaruskaha abo ukrainskaha narodaŭ, ani pakazaŭ na kryŭdu Biełarusaŭ, Ukraincaŭ abo Litoŭcaŭ dy tymbolš nie pastawiŭ damahańnie skasawańnia ichnych kryŭdaŭ. Bolš taho: za polski zakon, dziakujučy katoramu na našych ziemlach asielilisia i asialajucca polskija asadniki — hałasawali imienna hetyja „suproćfašystaŭskija“ polskija partyi. Hetyja-ž partyi nasyłajuć nam i swaich asadnikaŭ. A chto-ž čuŭ, kab naš biełarus dastaŭ niejdzie chutar u Polščy? Słowam, polski „Sialanska-Rabotnicki Front“ u adnosinach da niapolskaha nasielnictwa ŭ sučasnaj Polščy mała čym rožniŭsia dasiul ad taho frontu, suproć jakoha maje namier suproćstawicca.

Ale čas pieramianiaje ŭsio — kažuć tyja, što čakajuć pieramieny. Dyk i my čakali na pieramienu adnosinaŭ da biełaruskaj sprawy z boku polskaha „Sialanska-Rabotnickaha Frontu“.

Budziem-ža pryhladacca da farmalnaha twareńnia sialanska-rabotnickaha suproćfašystaŭskaha frontu, i prysłuchoŭwacca, jak hety front budzie adnosicca da h. zw. narodnych mienšaściaŭ u Polščy ahułam, a ŭ asobnaści, jak adniasiecca da sprawy biełaruskaj. Ad hetaha buduć zaležny i našyja da hetaha frontu adnosiny.

p.

Wincuk Adwažny 3)

Hanuliny kłapoty

ČAŚĆ II.

I.

Jość ŭ Amerycy kraina,
Što zawiecca Arhientyna.
Biełarusy, adkul byŭšy,
Dalaroŭ tak-siak zdabyŭšy,
Starym śledam što raz bolej,
Tudy honiacca za dolaj.
Jašče ŭsio było-b ničoha:
Dyj papieraŭ treba mnoha!
Hanna ŭžo saŭsim nia znała,
Na čym jejna sprawa stała.

Tak biada pa nowaj modzie
Adzinokaja nia chodzie:
Heta z lewa, taja z prawa —
Jak zabłutajecca sprawa,
Dyk razbłutać wielmi trudna.
Dola dobraja — marudna,
A biada halopam skača.
Adzin stohnie, inšy płača:
Ludzi dolu praklinajuć,
A hdzie lepšaja — nia znajuć...

Nie razważyŭšy tałkowa,
Tak, na pierša mužnia słowa,
Pradała Hanula chatku.
Raspradaŭšy da astatku,
Reštu tak parazdawała,
Što kamu pad ruku ŭpała.
Siadzić baba ŭ swajej chacie,
Dy ludziam arendu płacić,
Bo to chata ŭžo čužaja.
Hanna biednaja nia znaje,
Ci kuplać što, ci strymacca,
I nia maje čym zaniacca.
Jak sabrała hrašej horbu,
Paskładała ich u torbu:
Zakruciła, zawiazała,
Kapšučok na šyju ŭskłała;
Z imi jeła, z imi spała —
Ni kapiejki nie čapała...
A na dumcy mieła toje:
Choć najhorša dzieła złoje,
Choć biada, patreba, licha,
Ci što inša — siadzieć cicha.
A choć dochtar, choć apteka
Napadzie na čaławieka,
Tak sabie pastanawiła
I na nosie zarubiła —
Nie parušyć swajej kasy:
Trymać całyja zapasy
Na tu ważnuju hadzinu —
Na darohu ŭ Arhientynu.

Až tut wyjšła pieraškoda —
Dziŭna z metrykaj pryhoda;
Dyk papała baba ŭ nierat:
Ani ŭzad, ani upierad!...
Z taho hora, ambarasu
Zmarnawała dosyć času;
A tut termin prapuściła
I ahientu štraf płaciła
Za jahonyja kłapoty.
(Ustupiŭ na dziesiać złoty).
Jašče morščyŭsia, swaryŭsia,
Ale zara adpuściŭsia,
Jak z wuzła jamu dastała
Funcik masła, krajčyk sała.
Biadu babinu ubačyŭ
Nowy termin joj naznačyŭ;
Paciašaŭ jaje, śmiajaŭsia —
Wielmi babie spadabaŭsia.

II.

Nie stary byŭ pan „ahienty“;
Pierš Wincuk—ciapier „Wincenty“,
Byŭ ahientam hadok treci,
I trymaŭsia „ad wašeci.“
U wajnu jašče japonsku
Akademiju smarhonsku
Skončyŭ (Šlachcic jon ašmianski);
Mieŭ abyčaj, noraŭ panski:
Hryz zubami papiarosu,
Skrabaŭ palcam kala nosu,
Sop, jak huś, dy palcam pstrykaŭ;
Wiečna nosam čmychaŭ, mikaŭ..;

Na wajnie byŭ intendantam,
Ŭ Polščy niejkim kamandantam.
U palityku ŭmiašaŭsia:
Ŭ „Wyzwalency“ zapisaŭsia.
Jak da Sojmu stanawiŭsia
Z Biełarusami pabiŭsia;
Ŭ „Chłopskaj“ partyi aratar —
Zarablaŭ jak ahitatar:
Zdziorsia, biedny, i skryčaŭsia,
U „Be-Be“ pierapisaŭsia.
A usiudy wielmi mała
Hałasoŭ zabrakawała:
Dyk woś tak nia udałosia —
Być pasłom nie dawiałosia!

U kutok hłuchi zašyŭsia,
Sekwestrataram zrabiŭsia:
Tut adžyŭ Wincuk, razjeŭsia;
Čysta-hładka pryadzieŭsia,
Kapialuch kupiŭ, maniški,
Až woś... trapiŭ na Łukiški!
Z turmy wylez pośle hodu.
Klaŭ niaščasnuju pryhodu...

КНІГАПІС

Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар.

Biełaruski Narodny Kalendar na 1936 h. Wilnia 1936.

Рэдактар „Бел. Кр.“ пад вышэйазначанымі загалоўкамі прыслаў мне чатыры тонкія кніжыцы для рэцэнзіі. Разглядаю іх і думаю: нашто-ж мне аж чатыры штукі, мне і аднаго даволі. Аказваецца — гэта адзін календар, але выпушчаны ў сьвет у чатырох кніжыцах. Што такое, думаю — было ў беларусаў шмат чаго сьмешнага, але гэтага яшчэ ня было. Гумарыстычны, знача, фэльетон трэба пісаць, а не рэцэнзію. Але гумар не мая спэцыяльнасьць і зацяўшы зубы — гэта-ж самае раджу зрабіць чытачом — пераглядаю гэны „чатыракратны“ календар і інформую аб ім беларускае грамадзянства.

Адна кніжыца „Biel. Narodny Kalendar“ (лацінкай) на 48 бач. зьмяшчае календорыюм і розныя, бяз ніякай лёгічнай лучнасьці, гаспадарскія і іншыя практычныя рады. Гэта і ўсё.

Другая кніжыца „Biel. Nar. Kalendara“ (так-жа лацінкай) зьмяшчае: календорыюм, „Dudku Biełaruskuju“ выданую ў 1927 г. і... тыя-ж самыя рады, што й ў гэнай кніжыцы.

Узноў-жа адна кніжыца „Бел. Нар. Календара“ (гражданкай) мае ў сабе: верш Машары „Новаму Году“ (сапраўды прыгожы верш, шкода, што ён папаў у такі календар!), календорыюм, розныя рады. І ўсё.

Другая кніжыца „Бел. Нар. Календара“ (так-жа гражданкай), апрача ўсяго таго, што й у першай, мае яшчэ зборнічак беларускіх казак: Каваль, Зьмей, Рымша і інш., выданы ў 1929 г.

Ну, ці зразумелі, грамадзяне, што гэта за календар? Калі не, дык нічога не параджу, ясьней ня маю магчымасьці аб ім пісаць. Магу толькі яшчэ дадаць, што календар гэны — сапраўды „размавіты“ і „дзівосны“.

Ага, яшчэ на вокладцы (тоненькая каляровая папера) нешта напісана. Ёсьць там абвестка аб „Самапомачы“, аб Т-ве „Пчала“, аб кнігарні Ст. Станкевіча і... пералік собскіх выдаўца выданьняў. Інфармацыяў аб усіх іншых беларускіх арганізацыях нямашака. А гэта ўжо сапраўды праступна, каб хоцьбы й такі календар выдаваць і ня даць у ім поўнага інфармацыйнага аддзелу аб усіх беларускіх арганізацыях і ўстановах!

Словам, не календар, але насьмешышча календара і зьнявага беларускага нацыянальнага пачуцьця. Цэлы рад гадоў гэткім насьмешышчам быў беларускі адрыўны календар. Урэшце знашліся паважныя выдаўцы, якія пачалі выдаваць сусім паважны сьценны календар. Няўжо-ж ня знайдуцца ў беларускім грамадзянстве так-жа паважныя выдаўцы на паважны беларускі календар-кніжку? Ведаючы, якую вялікую нацыянальна-культурную ролю іграе ў народзе добры календар-кніжка, беларускае грамадзянства, ня гледзячы на ніякія сэнтымэнты, павінна скончыць з традыцыямі прымітывізму і здабыцца на такі календар, з якога была-б карысьць народу і з якім ня брыдка было б паказацца ў сьвет.

Агляднік.

Roznyja wiestki

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Ukraincy ŭ Anhlii. U Anhlii jość Anhielska-Ukrainski Kamitet. Hety Kamitet na apošnim swaim pasiedžańni 31.X. siol. pastanawiŭ wystupić prad anhielskim hramadzianstwam z prajektam zasnawańnia pry adnym z anhielskich uniwersytetaŭ katedry ŭkrainaznaŭstwa. Prafesarskija kruhi anhielskich uniwersytetaŭ da hetaj sprawy adnieślisia wielmi prychilna.

Z HAZET.

Imknieńnie na ŭschod. „Waršaŭski Dzieńnik Narodowy“ ćwierdzić, što ŭ Paznanščynie i na Pamorji wytwaryŭsia ciapier nadmier kupcoŭ, ramieśnikaŭ, handlaroŭ, asabliwa siarod maładoha pakaleńnia. Tam dla ich užo ciesna i jany šukajuć dla swajej ekspansii nowych terenaŭ. Endecki časapis u hetaj sprawie radzić nastupnaje: — Našym abawiazkam — kaža — jość naležna pakirawać henaj ludzkoj chwalaj, kab jana pajšła na ŭschod, kab jana stałasia padstawaj polščańnia haradoŭ i druhich wakolic na „Kresach Wschodnich“.

Jak bačym, polskija nacyjanalisty ab apalačańni „Kresuw Wschodnich“ ŭściaž turbujucca i dziela hetaha chacieli-b prysyłać u naš Kraj, aprača asadnikaŭ na ziamielnyja haspadarki, tak-ža ramieśnikaŭ, kupcoŭ i handlaroŭ.

Zanikańnie žyćciowaj radaści. U „Kurjery Waršaŭskim“ pajawiłasia ŭ artykule cikawaja zaŭwaha, što ŭ Polščy zanikaje žyćciowaja radaść. Ab hetym, miž inšym, čytajem tam nastupnaje.

„Polskaja hramadzkaja psychika chworaja. Moładź hadujecca ŭ atmosfery psychičnaha niezdaroŭja. Našyja damy, pamieškańni, usio žyćciowaje pawietra praniknuty turbotami bytu i niapeŭnaściaj isnawańnia. Dziela hetaha — pryhnoblenaść, dziela hetaha niama žyćciowaj radaści“.

Zanikła žyćciowaja radaść i siarod biełarusaŭ. Ale biełaruskaja hramadzkaja psychika nia chworaja. Biełarusy majuć ideju budučyni.

Niamieckaja hazeta ab Waršaŭskim pracesie. Niamieckaja hazeta „Der Deutsche in Polen“ — orhan niamieckaj katalickaj Partyi na Šlonsku, ab sudowym pracesie, jaki ciapier adbywajecca ŭ Waršawie, piša miž inšym hetak.

„...akt abwinawačańnia tolki mimachodam, wielmi aściarožna, uspaminaje ab pajezdcy abwinawačanych ukrainskich terorystaŭ u Niamieččynu, ab falšywych niamieckich pašpartach i ab berlinskich mužoch dawieru ŭ terorystyčnaj arhanizacyi“.

Pry hetym „Der Deutsche in Polen“ ćwierdzić, što miž ukrainskimi terorystami z Berlina i Haliččyny byŭ pasiarednikam niamiecki žurnalist i što aficer Niko Jary — adzin z wydatnych ukrainskich dziejačoŭ — biez pieraškodaŭ dzieić u Niamieččynie dalej.

Z POLŠČY.

Dekrety. Urad swaju haspadarčuju palityku prawodzić biezahladna — ŭściaž nowyja zakony ŭ hetaj sprawie dekretami Prezydenta wychodziać adzin za druhim. Hetymi zakonami nałožany padatak ad pensijaŭ, pabolšany dachodny padatak, abnižany ceny na cukar i inšyja manapolnyja i kartelnyja fabryčnyja wyraby. Cukar maje kaštawać 1 zł. za kilo.

Čynoŭniki pratestujuć. U minułuju niadzielu ŭ Waršawie čynoŭniki — dziaržaŭnyja, samaŭradawyja, handlowych pradpryjemstwaŭ i inšych branžaŭ — ładzili pratestacyjnyja zborki suproć nakładańnia na ich padatkaŭ ad pensijaŭ.

Zabastoŭka. Rabotniki wuhlakopnaj i hutnickaj branžy damahajucca 6 hadzinnaha dnia pracy. Dziela ŭzmacnieńnia hetych słušnych damahańniaŭ na minuły paniadziełak była abwieščana manifestacyjnaja zabastoŭka. Zabastawała bolš 35 tysiač rabotnikaŭ.

Nawarot da niapiśmiennaści. U ministra aświety była delehacyja wučycialoŭ, jakaja pradstawiła sumnyja naśledki namieranaha źmianšeńnia wydatkaŭ na škołnictwa. Pryrost ludziej wymahaje bolšych wydatkaŭ na škołnictwa, a nie źmianšeńnia ich. Aščadnaść u budžecie min. aświety źmianšeńniem wydatkaŭ na škołnictwa hrazić začynieńniem isnujučych školaŭ — kazali delehaty ministru. A heta było-b pawarotam da niapiśmiennaści.

Z ZAHRANICY.

Na relihijnym froncie ŭ Sawietach. Rasiejskaja patriaršaja eparchija ŭ Amerycy padaje:

— Balšawiki zwolnili z wastrohu mitrapalita Piotru Krutickaha.

— U paławinie krasawika 1936 h. u Maskwie budzie sklikany ŭsierasiejski carkoŭny Sabor dziela wybaraŭ patriarcha Rasiejskaj Prawasłaŭnaj Carkwy.

— Arhanizawanaja ŭ pačatku rewalucyi h. zw. „Žywaja Carkwa“ zusim zamiraje.

— Tulskaja kamsamolskaja arhanizacyja aružnaj fabryki prawiała siarod swaich siabroŭ ankietu ab adnosinach da relihii. Na ankietu adkazali — 27 procantaŭ, što „wykonwajuć relihijnyja abrady“, 33 proc. zajawiła, što hetym pytańniem nia cikawicca i 40 proc. wiarnuła ankietu niawypaŭnienaj.

Balšawickija maršały. My ŭžo padawali, što ŭ Sawietach wiernuty daŭniejšyja čyny ŭ wojsku. Z pasiarod čynoŭ najwyšejšym źjaŭlajecca čyn maršała. Hetymi dniami Rada Narodnych Kamisaraŭ S.S.R.R. rašyła nadać čyn maršała dla piacioch kamandzieraŭ čyrwonaj armii: Warašyławu, Tuhačeŭskamu, Jehorowu, Budzionamu i Blucheru.

Hrecyja. Paśla wiaśnianych krywawych zabureńniaŭ uwosień Hrecyja zawiała manarchiju. Hałoŭny i zaŭsiodny ŭ apošnich hadoch pawadyr hreckich rewalucyjaŭ Venizelos pryznaŭ manarchiju i abiacaŭ karalu, što budzie słužyć jahonaj abjednywajučaj sprawie.

Z KRAJU.

Zabastoŭka. U lasnych wokruhach Biełastockaha paw. bastuje kala 1000 lasnych rabotnikaŭ.

Wyzysk rabotnikaŭ. Biełastockija fabrykanty łamajuć zdabyčy rabotnikaŭ i zatrudniajuć ich u fabrykach bolš jak pa 8 hadzin u dzień.

Pažar. Nadowiačy ŭ Halšanach, Ašmianskaha paw. byŭ wialiki pažar — zhareła bolšaja čaść usich budynkaŭ hetaha miastečka.

Naša pošta.

Krapiwa. Karespandencyju atrymali, dziakujem, skarystajem.

Baćka. Piśmy pieradany, knižku wydali. Za karespandencyju dziakujem, skarystajem. Napišycie ab składańni ŭ Wašaj wakolicy deklaracyjaŭ za biełaruskuju školu. U sprawie pazyk — siahońnia tak staić sprawa, što wyhadniej iści na rasterminawańnie. A što moža być zaŭtra? — chtož heta skaža!

Haradockija rabotniki. Piśmo atrymali, z jakoha widać, što Wy nacyjanalna i palityčna zusim niaświedamyja. Budźcie aściarožnyja, kab Was nie sprawakawali worahi. Radzim bolš čytać biełaruskuju litaraturu i biełaruskija hazety.

Lebiedzieŭskija sialanie. U hetym i ŭsia našaja, biełaruskaja biada, što naš narod nacyjanalna i socyjalna mała świedamy. My woś i spaŭniajem hetuju rolu, što ŭświadamlajem narod i kličam usich świedamych biełarusaŭ twaryć supolny front suproć usich worahaŭ Biełaruskaha narodu.

Šejbaku. Prysłanyja na naš rachunak 5.35 zł. za kalendary pieradali adrasatu, a tak-ža pieradana i pažadańnie, wykazanaje ŭ adkrytcy.

Miranowiču. M. Dz. atrymali, dziakujem, čakajem abiacanaha rukapisu.

Śloznawoki. Atrymali i častku drukujem u hetym numary, a rešta skarystajem u nastupnym. Hazetu Wam budziem pasyłać.

Mart—nku. Dziakujem, drukujem, pišycie čaściej.

Hora. Piśmy atrymali, za karespandencyju dziakujem, u nastupnym numary budziem drukawać, pišycie bolš.

Buta. Za prysłanaje dziakujem, u nastupnym numary skarystajem.

Купляйце!

Беларускі Адр. Календар на 1936 г.

Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў. Хто адразу купае ад 10 да 25 календароў, плаціць 40 гр., ад 25 да 100 календароў — плаціць 37 гр., 100—300—35 гр., 300—1000—33 гр. за штуку.

Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „ПАГОНЯ“ Вільня, Завальная вуліца № 1—1.

Pośle ŭlez naš pan Wincenty
U zamorskija ahienty.
Ciapier ważnaja figura:
Załažyŭ takoje biura,
Hdzie wypisywaŭ šyf-karty —
Byŭ ahientam nie na žarty!

Jak toj kaža, moj susiedzie:
„Chto pamaža, toj pajedzie.“
Nie pamažaš ŭ wozie koła,
Dyk daroha nie wiasioła
Tabie budzie. Tak i heta:
Hanna, prostaja kabieta,
Ale tut dyk źmierkawała —
U paru pašmarawała....
Hrošy mieła, dziakuj Bohu,
Na dalokuju darohu;
A daroha niebaśpiečna,
Dyk woś musiła kaniečna
Ŭ karabli pamazać wosi.
Ahient dobry; kazaŭ: „Dosi
Z ciabie budzie: ty uboha—
Mnie nia treba, kaža, mnoha.
Biednym darma pamahaju,
A ty biedna, znaju, znaju!
Budź wiasioła, nia žurysia,
Lepiej Bohu pamalisia;
Jak to kažuć dobry ludzi:
„Było drenna — lepiej budzie“!

III.

Radaść serca raśpiraje:
Hanna jasny plany maje —
Ludzi dobry, Boh łaskawy!
U ksiandza, jak skončyć sprawy,
Świedkaŭ dobreńkich pastawić—
Zara metryku paprawić!
A jak „dowid“ zroibć synu,
Dyk machnie u Arhientynu!
Až sama sabie śmiajecca.
I woś joj užo zdajecca,
Što jana na mory: chwali
Karabielčyk padkidali;
Pry joj Pawał i Michasia.
A pahoda udałasia:
Było ciopleńka, pryhoža.
A wady... ach, mocny Boža!
Biezhraničny akijany...
Hanna dalej snuje plany,
Roić dumki: Janku bača
I ad radaści až płača.
Janka woś ich spatykaje:
Jaje, dzietak abyjmaje...
Cely čas na parachodzie...

Kali bačyć ŭ toj pryhodzie —
Na darozie lažać hrošy:
Dwaccać złotych! tož charošy
Byŭ haścinčyk u patrebie.
Hanna znaje, Boh na niebie
Maje Ohlad i apieku:
Nia daść zhinuć čaławieku.
Ŭziała hrošy, pahladzieła:
Hrošy dobry. Až spacieła;
Serca krepka stała bicca.
A jana čahoś baicca,
Choć kruhom niama nikoha.
„Što-ž takoje? Tut — ničoha:
Niama hrechu—ja-ž nia ŭkrała!“
Siabie Hanna paciašała.
A zdaloku hołas žudki —
„Pi-i-hi!“ kryčać knihutki.
Imhła nieba abłažyła.
Serca babina zamyła:
Niešta drennaje pračuła.
Ciapier inšy dumki snuła:
Woś, zdajecca, Janka chwory;
Była bura na tym mory.
Dzień prajšoŭ, druhi i treci...
Wielmi strašna: płačuć dzieci.
Rastuć chwali tak jak hory —
Bunt zrabiŭsia ŭ całym mory:
Chmary łučacca z wadoju,
Latuć chwali čaradoju,
Karabielčyk padkidajuć —
Im jak tresačkaj hulajuć...
Šum i tresk; skryhočuć liny:
Ŭžo papsulisia mašyny;
Nalacieli nowy chwali,
Karabiel toj zaliwali:
Niama hdzie jamu padziecca
I woś tonie, joj zdajecca...
Dziaciej tulić, k' sabie hornie...
Bača Janku, a jon stohnie...
Haława jaje ciažkaja;
Što z joj jość, sama nia znaje.
Ledź pryšła da chaty baba;
Dyk tak biednaj było słaba,
Što samleła, tak i pała
Sierad chaty, jak stajała.
Dzieci ŭ płač: nabiehli ludzi;
—Adcirali ruki, hrudzi;
Dali niuchać witrywolu
I skryčalisia u wolu.
Stawiać bańki; pośle chrenam
Wiski ciorli; dy palenam
Bili piaty, ščykatali,
Pakul duchu dapytali...
Hanna wočy adčyniła,
Da dziaciej prahawaryła;
Ŭžo na łožku nawiet sieła,
Ale zara jznoŭ samleła.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ“! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač“, Wilnia — Wilno Połackaja Nr. 9—4.

№7(18). СТУДЭНЦКАЯ ТРЫБУНА. 1.XII.35.

Няхай жыве наш Беларускі Студэнцкі Саюз!

Сэрца хвалюе радасьцяй. Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні дня 1-га сьнежня ўрачыста сьвяткуе 15-ці-лецьце свайго існаваньня. У гэты дзень будзе рабіць білянс сваей дзейнасьці, будзе падлічаць вынікі сваей працы, будзе радавацца з факту, што міма ўсякіх труднасьцяў да сяньняшняга дня пражыў, разьвіваўся і мае шырокія пэрспэктывы развою на далей.

У гісторыі беларускага студэнцкага руху Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні займае пачэснае месца. Зьяўляецца ён адным з арганізацыйных асяродкаў беларускага маладога жыцьця. Стаяў і стаіць на грунце ідэолёгіі беларускага адраджэнскага руху, высока і дастойна трымаючы нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

Праца ўнутры БСС, як і паза ім — увесь час праводзілася і праводзіцца пад гэтым сьцягам. А ўсякія спробы варожых дзейнікаў, — з Ускоду ці з Заходу, — накіраваныя на ўзарваньне БСС, як беларускай студэнцкай нацыянальнай і ідэовай арганізацыі, — былі рашуча ў самым пачатку нішчаны.

Ня маем магчымасьці ў вузкіх рамках гэтага артыкулу прадставіць жыцьцё і працу БСС за 15-год ягонага існаваньня. Заінтэрасаваны знайдзе усё гэта у органе БСС —„Наш шлях" (месячнік), які пачаў выходзіць у 1922 г. (вышла 4 нумары), і „Студэнская Думка" (таксама месячнік), якая выходзіла — непэрыядычна—ад 1924 г. да сёлетняга юбілейнага году (вышла усяго 15 нумароў). Мы тут радасна сьцьвярджаем, што БСС у меру сваіх сіл рабіў тое, што мог зрабіць: — гуртаваў у сябе студэнцкую моладзь, разьвіваў і гартаваў нацыянальнае ў ёй пачуцьцё, арганізаваў грамадзкую працу, наўперад у галіне культурна-асьветнай (лекцыі, рэфэраты, тэатральныя прадстаўленьні, канцэрты), разьвіваў таварыскае сужыцьцё сваіх сяброў (гарбаткі, вечарыны); дзеля шырэйшай прапаганды адраджэнска-вызвольных ідэяў беларускага народу, а так-жа дзеля абароны інтарэсаў беларускага студэнцтва на міжнародным форуме—уступіў і быў некалькі год (да 1934-35 акад. году) сябрам Аб'еднаньня Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў (АБСА), якое ўваходзіла ў склад „CIE" (Міжнароднае Студэнцкай Конфэдэрацыі),—увесь час утрымоўваў сувязь і супрацоўнічаў з студэнцтвам двух братніх народаў — літоўскага і ўкраінскага; апроч таго, сябры БСС—у меру магчымасьці прымалі актыўнае ўчасьце у розных грамадзкіх, а наўперад культурна-асьветных і навуковых беларускіх арганізацыях і установах у Заходняй Беларусі.

Вось больш-менш тыя кірункі і характар працы БСС за час яго дасюлешняга існаваньня.

У юбілейнае сьвята 15-тых угодкаў існаваньня БСС — жадаем яму памыснага далейшага разьвіцьця і плоднай працы для дабра беларускага народу, для ягонай лепшай і сьветлай будучыні.

Няхай жыве наш родны Беларускі Студэнцкі Саюз! Няхай жыве беларускае студэнцтва! Няхай жыве беларускі народ!

Рэд. „Студ. Трыбуны."

Студэнты Палякі аб Беларусах

На бачынах польскай штодзеннай газэты „Słowo" час ад часу зьмяшчаецца „Tydzień Akademicki," рэдагаваны студэнтамі з „Myśli Mocarstwowej".

У нумары 10 „Т. Ak." з дня 20 лістапада (Słowo Nr. 319) зьмешчаны артыкул Я. Круповіча «Absurdy białoruskie,» які сапраўды такі абсурдальны, што нельга аб ім замаўчаць, тым больш, што ня толькі так думае Круповіч аб беларускіх справах, як відаць з яго артыкулу, але большасьць польскага студэнцтва. Я. Круповіч піша аб беларускім руху і яго паўстаньні ня маючы аб гэтым найменшага паняцьця, або сьвядома піша ілжу. Ён, праўда, прызнае, што —„wsród ludu mowiącego językiem białoruskim rozbudziło się poczucie odrębności narodowej," але — бачыце— гэтае пачуцьцё паўстала дзякуючы агітацыі савецкіх агентаў!... Такая пастаноўка рэчы ёсьць ня чым іншым, як толькі дэмагогіяй з боку Круповіча. І як гэта не гарманізуецца з так правільным ягоным прызнаньнем, што „chłop kresowy używający języka białoruskiego chętniej czyta gazetę w tym języku, niż w innym." — Далей Я. Круповіч вылічае „morze potrzeb aktualnych" беларускага сялянства, перадусім з галіны асьветы і гаспадаркі, і заклікае бел. інтэлігенцыю памагчы яму — „przyjacielowi" беларускага народу — гэныя патрэбы спрэцызаваць. Ну, трэба падзякаваць яму за гэткую рупнасьць! Але няхай-жа Я. К. ведае, што яму лепей быць „polakiem w wolnej Polsce" і пісаць аб актуаліях „„chłopa kresowego", як нам беларусам працуючым для дабра беларускага народу у межах Польшчы.

Няхай-жа ведае Я. К., што цяпер на нашых сёлах аж кішыць ад розных польскіх арганізацыяў (SMK, KMW, Federacja і шмат інш. а нават Krakusy!) і ўсе яны заспакайваюць тыя „актуальныя" патрэбы. Аднак карысьць з іх тая, што беларускі селянін і надалей застаецца „w szalonej nędzy i biedzie" (словы Я. К.), і каб выйсьці з гэткага палажэньня — шукае сапраўднага натуральнага беларускага шляху, каб пайсьці па ім для асягненьня поўнай незалежнасьці, як эканамічнай, так і палітычнай. Беларуская інтэлігэнцыя даўно гэты запраўдны шлях зразумела і ідзе па ім самастойна. І хай ня дзівіцца Я. Круповіч, што статут Беларускага Студэнцкага Саюзу забараняе належаць сябром да польскіх ідэовых і палітычных арганізацыяў, бо па першае - нам не пазваляе гэтага рабіць наша нацыянальная беларуская годнасьць, па другое—ідэі Б.С.С. заўсёды будуць колідаваць з ідэямі хоць „najbardziej lojalnych" да Беларусаў польскіх арганізацыяў.

А. Дасюкевіч.

—о—

У гэтым-жа нумары „T. Akad.," у стацьці „Zapowiedź lepszego jutra," І. Пятроўскі піша між іншым: «Obecnie nie zwraca się uwagi na młodzież białoruską, ukraińską etc. Ci młodzi zapaleńcy już dzisiaj głośno twierdzą, że musi powstać niepodległa Białoruś, Ukraina, a Polska powinna oddać te ziemie, gdzie jest większość Rusinów czy Białorusinów. Te jednostki nie będą współpracować z nami, nie będą dobrymi obywatelami. Takim rzeczom warto aby w jakiś sposó zapobiec. Ale my najspokojniej spimy »

Вот-жа трэба сказаць І. Пятроўскаму, што ня нейкія „zapaleńcy" а ўся нацыянальна загартаваная і цьвяроза думаючая беларуская моладзь дамагаецца і павінна дамагацца самастойнасьці для сваей бацькаўшчыны.

Чаму гэтага Пятроўскі не разумее, або ня хоча разумець, няведама, хіба дзеля таго, што яшчэ сьпіць, як гэта сам прызнаецца!

А. Д.

Выкарыстайма калядныя фэрыі!

Зьбліжаюцца калядныя сьвяты. Незадоўга, бо 15 сьнежня большасьць калегаў і калежанак раз'едуцца па далёкіх кутках Беларусі. Не ў аднаго паўстане пытаньне, што рабіць, як правясьці найкарысьней час. Бязумоўна, што мы не павінны ставіць гэтыя пытаньні ў той плошчы, як іх ставяць студэнты з мяшчанскай ідэолёгіяй, мы не павінны выкарыстоўваць гэты час выключна у асабістым сэнсе. Цяжкое палажэньне нашага сялянства, неіснаваньне беларускага школьніцтва, зьнікомы лік беларускай інтэлігенцыі на мяйсцох— вось прычыны, якія змушаюць беларускую студэнцкую моладзь да выяўленьня як найбольшае актыўнасьці у сутычнасьці з сялянскай масай. Калі прымем пад увагу, што ёсьць яшчэ ў нас і такія ваколіць, гдзе беларускае сялянства па нясьведамасьці ўважае сябе за палякоў і нязначную сетку беларускіх культурна асьветных арганізацыяў на мяйсцох, і тыя труднасьці, якія напатыкаюць гурткі на шляху сваей дзейнасьці, дык ўсё гэта вымагае maxiмум выяўленьня актыўнасьці з нашага боку.

Будзем прабываць на правінцыі ладне часу, амаль месяц. Пры добрай волі і ахвоце можам правесьці значную культурна-асьветную работу. Пэўне-ж, у некаторых мяйсцовасьцях, куды паедзе студэнцкая моладзь ёсьць ужо беларускія культурна-асьветныя гурткі. Трэба памагчы гэтым гурткам зладзіць спэктакль-вечарыну. Моладзь мяйсцовая ахвотна горніцца да працы, толькі яскрава адчуваецца недахоп кіраўніцтва. Дык мы ў гэты час пастараймася быць памацнікамі і мусімо прычыніцца да ажыцьцяўленьня культурна-асьветных пачынаньняў вясковае моладзі. Там-жа, гдзе няма гурткоў, таксама можна згрупаваць моладзь і зладзіць прадстаўленьне Добра-б было, каб калегі і калежанкі прыступілі ўжо да апрацаваньня рэфэратаў з галіны беларусазнаўства, як з гісторыі Беларусі, з беларускай географіі, або папулярных рэфэратаў з галіны навуковае і прачытаньня іх на мяйсцох.

Поле да працы маем аграмаднае. Працу нацыянальна ўсьведамляючую мы можам праводзіць на кожным шагу. Ня буду вылічаць, гдзе і як. Пры добрай ахвоце кожны выбярэ мейсца і спосаб паводле сваіх нахілаў і уздальненьняў. Сьвятам, вядома, зьбіраюцца старэйшыя сяляне на пагаворкі. Вот і акалічнасьць, гдзе можна прачытаць пару цікавых і кароценькіх апавяданьняў. Тым больш цікавіцца беларускімі кніжкамі вясковая моладзь. Гдзе-ж няма гэтага зацікаўленьня, пастараймася яго выклікаць.

Шырэньне беларускага друкаванага слова ёсьць таксама важнай і неабходнай справай. Гдзе не даходзіць беларускі часапіс трэба пастарацца аб тым, каб сяляне яго выпісвалі. Калі ня можа гэтага зрабіць адзін чалавек, то хай зложацца і цэлаю вёскаю выпішаць хоць адну бел. газэтку.

Там, гдзе няма культ.-асьветных арганізацыяў, нашым абавязкам зьяўляецца, залажыць ці прыгатаваць грунт да зарганізаваньня такой. Каліж мы правядзём гэтую работу, паводле сіл і магчымасьцяў кожнага, то можам сьмела варочацца ў Вільню з цёплым і прыемным пачуцьцём выкананьня тых абавязкаў, якіх вымагае ад нас Бацькаўшчына.

М. З.

Крытыка „Крытыкаў"

Крытыка — старая гэта хвароба нашай беларускай студэнцкай сям'і. І дзеля таго, што яна старая, дык так укаранілася паміж сяброў, што нятолькі дахторскія лекі, але і знахорскія чары ня змогуць яе абсіліць. Бяз ніякіх крытэрыяў, — крытыкуюць калегі і калежанкі. Крытыкуюць рэфэраты, аксыяматы, праўду і фальш, калі трэба і нятрэба. Крытыкуюць усіх — ніколі сябе. Некаторыя сябры так захапіліся крытыкай, што стварылі сабе нават крытычнае жыцьцё, крытычны спорт, сон і каханьне!.. Забываюцца яны аб адным, што цяпер ёсьць час надта крытычны...

Сяньня ў 15 угодкі існаваньня нашай працы ў Саюзе, гляньма крытычна на самых сябе, ды возьмемся яшчэ з большай энэргіяй за працу творчую, ціхую, але плодную, а пакінем безкарысныя крытыкі. Перад намі каляды, вёска, браты жадаючыя веды, перад намі сьвятая Бацькаўшчына Беларусь. „Vox, vox et praetera nihil"—гэта за мала!

В.

Сьвяткаваньне дзесятых Угодкаў Літоўскага Студэнцкага Саюзу у Вільні.

Літоўскі Студэнцкі Саюз у Вільні сьвяткаваў сёлета 23 лістапада 10-ыя ўгодкі свайго існаваньня.

Урачыстасьць пачалася набажэнствам у касьцеле сьв. Мікалая ў прысутнасьці літоўскай студэнцкай моладзі, прадстаўнікоў ад старэйшага літоўскага грамадзянства, літоўскіх студэнцкіх арганізацыяў з Незалежнай Літвы і эміграцыйных, а таксама у прысутнасьці прадстаўнікоў беларускага і украінскага студэнцкіх саюзаў у Вільні. Па набажэнстве адбылося, такжа у касьцеле, пасьвячэньне сьцягу Літоўскага Студэнцкага Саюзу.

У цэрэмоніі забіваньня ў сьцяг цьвякоў прымалі ўдзел прысутныя прадстаўнікі усіх арганізацыяў, а між імі ад БСС. старшыня калега Шчорс, які убіў цьвек з ініцыяламі Белар. Студ. Саюзу.

Вечарам, гэтага-ж дня, адбылася у залі Літоўскай Гімназіі ім. Вітаўта Вялікага урачыстая акадэмія. На першую часьць акадэміі злажылася: уступнае слова, справаздаўчы рэфэрат з дзейнасьці Л. С. С. за 10 гадоў існаваньня многія прывітаньні ад паасобных, адзінак і арганізацыяў літоўскіх з Незалежнай Літвы і заграніцы, а таксама ад Украінскай Студэнцкай Моладзі у Вільні. Ад імя БСС. Літоўскі Студэнцкі Саюз прывітаў кал. П. Засім.

У сваей гарачай прамове падчыркнуў к. Засім, што доля і нядоля нас злучыла і што адных 10 гадоў супольнага супрацоўніцтва беларускага і літоўскага студэнцтва мы пражылі, а другіх 10 гадоў пачынаем. Далей гаварыў, што крыўды літоўскага народу былі адначаснакрыўдамі беларускага народу — а радасьці Літоўцаў былі адначасна радасьцямі і Беларусаў. Закончыў прамоўца клічам, каб жыло і разьвівалася беларуска-літоўскае супрацоўніцтва для дабра абодвых народаў.

У другую частку ўрачыстасьці увайшлі дэклямацыі, літоўскія народныя песьні ў выкананьні хору і салістаў Літоўскага Студэнцкага Саюзу. Літоўскаму Студэнцкаму Саюзу жадаем і на далей карыснай працы для дабра свайго народу.

Ш.

Рэдакцыйная Калегія «Студэнцкай Трыбуны» ў складзе: А. Дасюкевіч, М. Смафшчок, А. Махонька, В. Папуцэвіч і М. Канцэлярчык.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič